Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

# ДУМКА ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодна, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.

Нявпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош, сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 3 — Вільня, Серада 11-га студзеня 1928 г. — Год I



## Праграмны трафарэт.

Ня так даўно на старонках прэсы прыхвосьцяў міжнароднай буржуазіі („Сял. Ніва", „Bieł. Krynica", „Праваслаўная Беларусь" і інш.) зьявілася прадвыбарная праграма усіх гэтых рознагалосых ашуканцаў беларускіх працоўных гушчаў, пад назовай „Плятформа Беларускага Цэнтральнага Аб'яднанага Выбарнага Камітэту Блёку Нацыянальных Меншасьцяў". Уся праграма разьбіваецца на сем частак, якія датычацца „агульна-палітычных правоў беларускага народу", зямельнага пытаньня, работніцкага пытаньня, эканамічнага пытаньня наагул, школьнага і рэлігійнага. Сёмы пункт заквечвае сабою ўсю праграму „змаганьнем" за ўсе свабоды.

Праграма гэта разьлічана пераважна на шырокія пласты працоўнага народу, таму вялікіх слоў не пашкадавана. Прадаўшы тайком беларускія працоўныя масы нямецкай, жыдоўскай і літоўскай буржуазіі, прадаючы іх яўна ў працягу апошніх гадоў гэтыя прыяцелі Кіртыкліса (начальнік бясьпечнасьці ў Вільні, асабісты прыяцель п. Ярэміча)—ў дні, калі патрэбны сялянска-работніцкія галасы, прыходзяць да гэты гушчаў з масьлічнаю галінкаю, дакляруючы ім усё, што толькі яны могуць выгаварыць, не чырванеючы (а зладзеі, як вядома, ніколі не чырванеюць). Разьбіраць падрабязна ўвесь гэты набор слоў, якія ўжо згубілі сваю вартасьць, усе гэтыя мудраваньні для падладжваньня да душы працоўных—заняло-б даволі шмат месца. Наагул у палітыцы шмат гэтых т. зв. высокіх слоў да таго забруджаны, апаганены вуснамі палітычных спэкулянтаў самай рознакалёровай масьці, што яны згубілі тое запраўднае значэньне, на якое па свайму назову мелі-б права. Што такое ў нашыя часы словы—дэмакратыя, навет сацыялізм? Яны сталіся звычайнымі шыльдамі палітычных крамак для прываблэньня і зацягваньня лёгкавернай публікі, яны красуюцца ў праграмах самых яўных людажораў, імі апутваюць несьвядомыя галовы ўсякі, хто толькі жадае выманіць навет у пагарджаных імі шырокіх гушчаў галасы. Калі мы пакінем на час праграму нашых здраднікаў і возьмем блізкія да іх праграмы Паўлюкевіча і Умястоўскага, возьмем урэшце праграмы любой беларускай партыі ці групы, пяройдзем да польскіх ППС, Вызваленьняў і дойдзем навет аж да эндэкаў—то ўсюды мы знойдзем запраўдныя мэты гэтых ашуканцаў працоўных гушчаў апраненымі ў тую-ж вопратку прыгожых і высокіх слоў, якія служаць для іх рэклямай.

Праглядаючы больш падрабязна плятформу нашых „аб'яднаных" прыхвосьняў буржуазіі — убачым, што гэта звычайны, узяты на пракат з любое палітычнае крамкі — набор слоў, з выбарам „высокіх" і „прыгожых", слоў, якія ўжо да таго зьбіты, што сталіся звычайным шаблёнам, ці трафарэтам, тою зробленаю з паперы формаю, пры дапамозе якое на самых розных сьценах ад панскіх палацаў да сялянскіх хатаў – малююць тыя-ж самыя ўзоры, краскі і малюнкі. Хто глядзіць на гэтыя ўсе ўзоры першы раз — яны здаюцца цікавымі і прыгожымі. Хто-ж ведае спосаб іх прыгатаваньня, хто іх бачыў не адзін раз— яны выклікаюць агіду.

Так! Агіду выклікаюць гэтыя „высокія" і „прыгожыя" словы аб'яднаных ашуканцаў, якія разьлічаны ўсе на тую-ж несьвядомасьць і неразборлівасьць працоўных гушчаў, галасамі якіх гэтыя манюкі хочуць уехаць у Сойм, словы, узятыя на сэзон з лічных трафарэтных такіх-жа сэзонных праграмаў ашуканцаў, якія падобна нашым у сваей папярэдняй дзеяльнасьці зрабілі ўсё магчымае, каб апаганіць гэтыя самыя словы.

Есьць шмат чаго ў гэтым прадвыбарным трафарэце, што патрабуе спэцыяльнага разбору, які ўжо на аснове іх-жа выявіў-бы ўсю ману і запраўдную ашуканчую сутнасьць іх тварцоў, усе гэтыя паўтарэньні аб ратаваньні балячак праз парлямант, гэтыя адступленьні, зводзячыя на нішто навет самы трафарэт, усе гэтыя месцы, якія проста супярэчаць навет набраным трафарэтным словам. Будзем мець магчымасьць вярнуцца да гэтага.

Але мы ня так глядзім на працоўныя гушчы, як палучаныя ў адну кампанію здраднікі, якія, спадзяючыся ашукаць гэтыя гушчы, пускаюць ім у вочы туман высокіх слоў, не саромячыся навет таго, што яны ўзяты з даўно прыгатаваных трафарэтаў. Мы ведаем запраўдныя настрої і палітычную сьпеласьць беларускіх працоўных гушчаў, якія перажылі за апошнія часы так шмат, што ўжо яны добра адрозьніваюць трафарэты ад сваей запраўднай сялянска-работніцкай праграмы, якое яны, мы пэўныя, чакаюць і якую яны ўжо самі сабе выраблі.

Ашукаць удасца раз, можа ўдасца яшчэ больш—але ашукваць па трафарэту, заўсёды — ня ўдасца. Гэтаму зарукай — сьвядомасьць і палітычная сьпеласьць беларускіх працоўных гушчаў.

## СЯЛЯНЕ і РАБОТНІКІ! 15-га студзеня апошні дзень паверкі сьпіскаў выбіральнікаў. Сьпяшайцеся даведацца, ці Вы і Вашы знаёмыя занесены у сьпіскі!

## Перагляд „пляну Доўса" і яго скуткі.

На шляху канчальнага вызваленьня Нямеччыны стаяць, як ведама, дзьве рэчы, дзьве перашкоды: ваенная акупацыя вялікай нямецкай ракі — Рэйну „саюзьніцкімі" войскамі і абавязак сплаты вялізарнай ваеннай кантрыбуцыі на карысьць пераможцаў. Сплата гэтых „адшкадаваньняў", як ведама, рэгулюецца так званым „плянам Доўса", паводле якога немцы ўжо тры гады сумленна выконваюць свае абавязкі.

Акупацыя Надрэнії саюзьніцкімі войскамі мела сэнс—так-сказаць,—„ваеннага залогу" нямецкай тэрыторыі — дзеля забясьпечаньня — выкананьня немцамі Вэрсальскага Трактату, а перадусім — разбраеньня і сплаты гэтых „адшкадаваньняў". Але разбраеньне Нямеччыны ўжо афіцыяльна сьцьверджана міжсаюзнай ваенна-кантрольнай камісіяй і Радай Паслоў Антанты, зьліквідаваўшай і самую гэту камісію. Астаецца гэткім чынам, як праўны ды мэтны матыў далейшага ўтрыманьня акупацыі, толькі і выключна — забясьпечаньне сплаты „адшкадаваньняў".

Трэба добра зразумець, якую вялізарную вагу для канчальнага вызваленьня Нямеччыны з-пад каманды Францыі мае скасаваньне акупацыі, якая фактычна — трымае ўсьцяж расчыненымі ўсе заходнія граніцы і брамы ў Нямеччыну, дазваляючы саюзьнікам у любы мамэнт балюча націснуць на нямецкую ўладу, змушаючы яе—падпарадкавацца іх—хай навет бяспраўным—загадам.

З усіх навагодніх выслаўленьняў нямецкай прэсы, з усіх афіцыяльных заяваў і прамоваў адказных прадстаўнікоў нямецкай Рэспублікі, пачынаючы ад самога прэзыдэнта — ясна відна, якой страшэннай абразай „гарыць" на дзяржаўным гонары нямецкага народу гэта акупацыя яго зямлі „саюзьнікамі", якія ўжо аж тры гады, як абвясьцілі „роўнапраўнымі", — а год ужо, як прынялі Нямеччыну — „у сям'ю родных і роўных нацыяў Лігі"...

———

Дык дзіва, што нямецкае кіруючае грамадзянства—побач з дыплёматычнай акцыяй свайго ўраду—у кірунку зьменшаньня акупацыйных войскаў (у мінулым годзе каля 11 тысячаў іх было вывезена з краю)—шмат высілкаў сваіх скіравала і ў бок—перагляду справы адшкадаваньняў, перагляду гэтага „пляну Доўса". Дамо сьпярша чытачом некалькі цікаўных лічбаў.

Сьпярша саюзьнікі, пабіўшы немцаў дый узваліўшы на іх цалком усю віну за выбух вайны, зажадалі, каб нямецкі народ заплаціў ім — усе кошты ды страты вайны, якіх яны налічылі штосьці каля 500 мільярдаў залатых марак.

Пасьля — якраз у зьвязку з „плянам Доўса"—гэтая агульная сума „адшкадаваньняў" была зьменшана — да 132 мільярдаў. Гэтую вялізарную суму нямецкі народ мае выплаціць у працягу некалькіх дзесяткаў гадоў, плоцячы — ад гэтага году ўжо рэгулярна па два з паловай мільярды ў год, з якіх больш паловы мае атрымліваць Францыя...

Гэткім чынам,—за супольныя грахі даваенных імпэрыялістычных урадаў, выклікаўшых страшэнную бойню народаў, некалькі пакаленьняў нямецкага народу маюць плаціць сваей працай, падтрымліваючы тым самым школьную ды недарэчную — ваенную гэгемонію (панаваньне) Францыі ў Эўропе... Ясна ўжо з гэтага значная фантастычнасьць гэтай кантрыбуцыі. Проці ж гэтай мілітарнай гэгемоніі Францыі ў Эўропе—даўно ўжо стварыўся—сярод раскалоўшайся Антанты—„проціфранцускі фронт", які вельмі спрытна магутна павялічваецца ўсьцяж ды выкарыстоўваецца нямецкай дыпляматыяй—у мэтах канчальнага вызваленьня Нямеччыны. Усё гэта значна аблягчала нямецкай дыпляматыі—барацьбу з гэтым „плянам Доўса".

Але, апрача дыпляматычнай акцыі ў Эўропе, немцы, як сказана, усьцяж вядуць дакладна абдуманую акцыю—„на фінансавым фроньце" — на груньце Амэрыкі, якая трымае на „залатым абрусе" ўсе эўрапэйскія дзяржавы, страшэнна згалеўшыя ў часе вайны...

Самы гэты „плян Доўса" быў апрацаваны — па думцы нямецкіх фінансістаў — у супрацоўніцтве з амэрыканскімі ды англійскімі — проці апору Францыі. Падпісваючы „плян Доўса", немцы атрымалі вялізарную пазыку (800 мільёнаў) ад Амэрыкі, а пасьля ў працягу 3 гадоў—усяго набралі ў Амэрыцы пазыкаў аж на тры мільярды. На гэтыя пазыкі—шляхам шчырай ахвярнай працы — немцы добра разбудавалі сваю прамысловасьць, прадуктамі якой у значнай меры сплачваюць кантрыбуцыю, пабіваючы гэтым прамысловасьць саюзьнікаў.

Але амэрыканскія пазыкі Нямеччыне павінны былі па нямецкай думцы — йграць падвойную ролю: ня толькі памагаць краю разбудаваць свае прамыслова-творчыя сілы, але адначасна і—даводзіць саюзьнікам, што бяз гэтых пазыкаў — Нямеччына ня можа выплаціць адшкадаваньняў...

Але-ж, з другога боку — пазычыўшы спрытна вялізарныя сумы ў Амэрыцы, Нямеччына пачала скардзіцца сваім усемагутным амэрыканскім апякуном крэдытарам, на тое, што „плян Доўса" — перашкаджае ёй спраўна сплачываць ім пазычаныя ў іх грошы... Запраўды-ж—паводле „пляну Доўса"— сплата адшкадаваньняў саюзьнікам стаіць на першым месцы, а толькі пасьля гэтага Нямеччына можа выдаваць грошы на ўсе іншыя патрэбы свае, у тым ліку і—на сплату сваіх замежных пазыкаў..

Як бачым, усё было вельмі спрытна абдумана згары ды падрыхтавана немцамі так, каб,—падняўшы ў патрэбны час справу перагляду „пляну Доўса", мець на сваім баку ўсіх тых, ад каго залежыць памыснае для немцаў вырашэньне справы...

———

Калі-ж усё было падрыхтавана, тады здарэньні пайшлі чаргой адно па адным — гладка, як па маслу.

У восені нямецкі ўрад унёс у Сойм новы бюджэт, у якім асыгнаваў вялізарныя сумы—на палепшаньне быту сваіх дзяржаўных працаўнікоў і на іншыя важныя рэчы.

Амэрыканскі агент, які — на падставе „пляну Доўса" — пасаджаны быў у Бэрліне, каб кантраляваць усю фінансавую гаспадарку Нямеччыны, забясьпечваючы спраўную оплату адшкадаваньняў, падаў нямецкаму ўраду дый усім „саюзьнікам" Мэморыял, у якім востра крытыкаваў новы нямецкі бюджэт, як пагражаючы якраз—спраўнай сплаце адшкадаваньняў і працэнтаў па амэрыканскіх пазыках Нямеччыне.

Гэтым мэморыялам справа адшкадаваньняў была адразу пастаўлена на чаргу дня. Нямецкі ўрад і ўся нямецкая прэса востра зьбівала крытыку „рэпарацыйнага агента", даводзючы, што—бюджэтныя выдаткі—канешныя для ўтрыманьня міру і ладу ў краі, а што вось запраўды-ж—вялізарных адшкадаваньняў, прадбачаных у „пляне Доўса", нямецкі народ плаціць больш ня можа. Найвыдатнейшыя фінансісты Англіі, Швэцыі, Галяндыі падтрымалі Нямецкі пратэст проці „пляну Доўса". Бюджэт быў амаль не цалком—зацьверджаны парляментам, — ня гледзючы на ўсе пратэсты агента і саюзьнікаў.

У самым канцы году той-жа „рэпарацыйны агент" п. Джыльбэр Паркер, які некалькі тыдняў таму востра крытыкаваў нямецкі ўрад за яго фінансавую гаспадарку, апублікаваў чарговую гадавую справаздачу— аб выкананьні Нямеччынай у 1927 годзе „пляну Доўса".

І вось, у гэтай справаздачы п. Паркер, даверавы амэрыканскіх капіталістаў-крэдытараў Нямеччыны і усіх саюзьнікаў, пасьля лічбовага матэрыялу, кажа зусім выразна — ужо аб канешнасьці поўнага перагляду, амаль не — скасаваньня „Пляну Доўса", як зусім недарэчнага дый шкоднага—ня толькі для гаспадарчага разьвіцьця Нямеччыны, але і для яе крэдытараў...

Ён кажа, што „плян Доўса" ўжо споўніў сваю задачу: даказаў усяму сьвету і саюзьнікам — шчырае жаданьне ды сумленнасьць Нямеччыны ў сплаце адшкадаваньняў. Цяпер трэба скасаваць увесь прадбачаны „плянам" апарат фінансавага кантролю над Нямеччынай, а—замест усяго гэтага — проста ў паразуменьні з Нямеччынай устанавіць агульную суму, якую немцы маюць заплаціць,—спыніўшы тую сыстэму прымусовых канфіскатаў — на карысьць адшкадаваньняў—часткі даходаў—з нямецкіх чыгунак, прамысловасьці дый іншых галінаў нямецкай гаспадаркі, сыстэму, яўна руйнуючую апошнюю...

Гэткім чынам, амэрыканскі „рэпарацыйны дырэктар" у Эўропе трэбуе—поўнага скасаваньня, так-сказаць,—фінансава-гаспадарчай акупацыі Нямеччыны, якой у сутнасьці і быў „плян Доўса", а замест яе — прапануе—на падставе заслужанага Нямеччынай—поўнага даверыя—разглядаць яе рэпарацыйныя забавязаньні, як звычайныя дзяржаўныя даўгі, якія нямецкі ўрад мае сплачываць сам—звычайным парадкам...

Гэткім чынам, Амэрыка сказала свае важкае слова: плян Доўса, сума агульная адшкадаваньня, наагул справа рэпарацыяў—павінны быць і будуць перагледжаны... Гэта ўжо—вялізарны пасьпех Нямеччыны. Цяпер адчыняюцца для Нямеччыны ўсе магчымасьці далейшай барацьбы за карыснае для яе рашэньне справы.

———

У францускай прэсе „Справаздача" Дж. Паркера выклікала ўражаньне выбуху бомбы.

Але ў хуткім часе францускія фінансавыя колы дазедаліся аб тым, што гэтая чарговая „нямецкая інтрыга", якая пагражае новай фінансавай катастрофай Францыі, надрыхтавана была ня столькі ў Бэрліне, як у Нью-Іорку ды Лёндане!!.

Аказваецца, што „плян Доўса", якога цяжкія скуткі для краю нямецкія прамыслоўцы зьмягчалі эканамічным супрацоўніцтвам з францускімі (трэсты—вугальны, жалезны, хімічны дый інш.), плоцючы частку адшкадаваньняў таварамі ды сырцом, гэтым самым страшэнна біў па прамысловасьці англійскай... Англія, якая з вялікім цяжарам павінна штогодна плаціць 4 мільярды залат. франкаў Амэрыцы за ваенныя пазыкі, зусім не заінтарэсавана ў тым, каб неяк „падружыўшаяся" гаспадарча з Нямеччынай Фран

цыя разам з Нямеччынай руйнавала яе гаспадарчы дабрабыт. Дзеля таго—Англія пастанавіла—узарваць „плян Доўса“, даказаўшы Амэрыцы, што Нямеччына ня можа плаціць адшкадаваньняў, а дзеля таго Амэрыка павінна зьменшыць і суму англійскага доўгу Амэрыцы...

З другога боку, паехаўшы з сваей справаздачай у Амэрыку сам „рэпарацыйны агент“ п. Паркэр, так настрашыў там амэрыканскіх фінансавых каралёў—небясьпекай з боку „пляну Доўса“ для амэрыканскіх капіталаў, уложаных у нямецкую гаспадарку, што ўсе яны патрабавалі аднагалосна — безадкладнага скасаваньня „пляну“!..

Усе гэтыя „банкаўскія каралі“ мелі навет зараз-жа апублікаваць супольны пратэст проці „пляну“, і толькі просьба самога прэзыдэнта... спыніла дыплёматычны скандал такога адкрытага ўмяшаньня амэрыканскіх фінансавых камандзіраў у-ва „ўнутраныя справы Эўропы“...

—•—

Ясна, што—калі Амэрыка, Англія дый сама Нямеччына, усе яны — проці „пляну Доўса“, дык трэба лічыць яго хаўтуры толькі пытаньнем часу!..

Апор Францыі, якая фінансава—цалком у руках Амэрыкі, Англіі і Нямеччыны, — ня можа цяпер зрабіць нічога.

Францыя, якая толькі-што—працай Пуанкарэ, а яшчэ больш—вялізарнымі сумамі, якія ідуць у яе скарб з Нямеччыны—з тытулу адшкадаваньняў, так-сяк папрвіла свае фінансы, і ў далейшым будуе ўсю сваю фінансавую дзяржаўную гаспадарку—на плянаваных штогодных уплывах з Нямеччыны ў францускія касы аднаго мільярду і трохсот мільёнаў залатых марак (52%—з 2½ мільярд). І вось, як сьцьвярджае ўся француская прэса, Францыі пагражае новая фінансавая катастрофа... — Ці адратуе з яе Францыю які Пуанкарэ — без нямецкіх адшкадаваньняў, якія ўсё больш робяцца няпэўнымі, гэта — вялікае пытаньне...

Зьняцьце часткі вялікіх цяжараў з нямецкага народу і яго прамысловай працы, адчыніць шляхі для далейшай разбудовы гаспадарчага, а патым і палітычнага жыцьця Нямеччыны, павялічыць і далей яе міжнародную сілу ў сьвеце.

Але ж гэта самае адначасна, як сьцьвярджае ўся француская прэса, страшэнна — аслабіць сілу Францыі—унутраную і вонкавую ў сьвеце...

Як бачылі мы, як у тым, таксама і другім,—выразна зантарэсаваны дый не хаваюць гэтага—Амэрыка і Англія, ня кажучы ўжо аб Італіі, дый—самай Нямеччыне...

Дык—ці ж можна думаць, што здолее—пасьля скасаваньнем гаспадарчай акупацыі Нямеччыны—надалей утрымацца — ваенная акупацыя яе зямлі, якую падтрымлівае толькі і выключна воля Францыі, яе дыктатарскай ролі ў Эўропе хутка прыходзіць канец...

А—з канцом гэтага панаваньня Францыі ў Эўропе цесна зьвязаны перагляд і сыцягу палітычна-тэрытарыяльных справаў у Эўропе, які—зараз жа рашуча паставіць Нямеччына на чаргу дня. А гэта ўжо можа адбіцца і на лёсах нашага краю.

А магчыма і іншае яшчэ. Катастрофа фінансавая ў-ва Францыі можа стацца катастрофай і ўсяе палітыкі францускай буржуазіі і—ці папхне яе ў бок згоды з СССР — ці дасьць магчымасьць францускім працоўным гушчам палажыць канец і ўсяму панаваньню „сваей“ буржуазіі.

## Надзеі п. п. Умястоўскага і Гурына і іх аргумэнтацыя.

Хто тры месяцы тому думаў аб тым, што польскі акцызьнік, дастаўшы спэцыяльны водпуск на выбарны сэзон і пачаўшы выпускаць газэту ў беларускай мове пад назовам: „Беларускі (?) Дзень“, запраўды паважна думаў аб даручанай яму так важнай місіі? Аднак, падзеі апошніх дзен ня толькі кажуць аб процілежным, а навет даюць выразна да зразуменьня, што пераменіўшы службу акцызьніка на службу больш „панэнага“ ведамства, пан Умястоўскі разам з сваім патронам Гурынам і самі сур'ёзна паверылі ў пасьпех сваё місіі і, апрача таго, іншых пераконваюць, што імення яны, і ніхто болей, маюць усе шансы праз сваю місію зрабіцца... адзінымі (не палохайцеся!) прадстаўнікамі беларускага народу (чулі?). Сваю пэўнасьць гэтыя ураднікі запраўды-ж асаблівых даручэньняў легічна аснoўваюць такім чынам, як гэта зроблена ў адной з перадавіц „Бел. Дня“: „Перад выбарамі“.

Есьць чатыры блёкі на выбары: „Хіены“ (польскай правіцы), блёк Нац. Меншасьцяў, Грамадаўскі (ці ня з гробу выкапалі паны Умястоўскі і Гурын гэтую нябожчыцу?) і... дэмакратычны.

З гэтых чатырох блёкаў першыя тры зьяўляюцца працаўнікамі Ураду Маршала Пілсудскага (ці ўсе толькі, паночкі?). Дзеля гэтага ім грозіць гібель на выбарах. І толькі чацьверты блёк, у які ўваходзіць „усё... і нашы ураднікі, якія падцерживаюць Маршалка, маюць (чуць не адзіныя) шансы папасьці ў Сойм.

Так і запішам!...

Ды бязумоўна-ж гэта яшчэ ня ўсё. Як ні „сільныя“ аргумэнтацыі пэўна-ж маючых уладу п. п. Гурынаў і Умястоўскіх — гэтым яшчэ ня прыдбаеш сабе так жаданых мандатаў, бо яны залежаць якраз не ад Ураду Маршалка, а ад сьвядомасьці працоўных гушчаў, якія хоць на гэты раз „маюць слова“. І гэта таксама прадбачана ў нашых янычараў (гвардыі турэцкіх султанаў, злажанай з славянскіх дзяцей і выхаваных у духу ненавісьці да гэтых-жа славянаў); гэта былі страшныя каты сваіх народаў. І яны таксама зьвярочваюцца да працоўных гушчаў.

Але як зварочваюцца? А так, як і пачалі. Паянычарску! Яны ня маняць да сябе салодкімі абяцанкамі, не абманваюць мягкімі падушкамі, як п. п. Ярэмічы, Рагулі, Сабалеўскія, розныя хрышчоныя дэмакраты, а проста з моста—страшаць. Страшаць ужо сваей прыхільнасьцю да Ураду (а мы лічым, што яны выступаюць у якасьці ураднікаў), страшаць яшчэ і іншымі спосабам. Аб гэтым гавораць нам стацьці ў № 2 (42) „Беларускага Дня“. „Перасьцярога ўсім б. Грамадаўцам“ ды перадавіца: „Лёс грамадаўцаў у БССР“. Яны страшаць, што нейкая закансьпіраваная ў Вільні „цэнтраля Грамады“ правакуе масы, кіруючы іх у БССР, дзе імі запоўнены ўсе турмы, або адкуль іх варочаюць назад і аддаюць у рукі польскай паліцыі. Зьвязваючы гэтыя высасаныя з пальца весткі аб існаваньні надпольнай цэнтралі Грамады і накіраваньнем ёю б. Грамадаўцаў у БССР з фактам існаваньня беларускай радыкальнай прэсы, на якую яна піша адкрыты (міма бязумоўна тайнага) данос, каму трэба—нашы янычары наіўна пытаюцца ў „газэты „Права Працы“ і іншых ёй падобных газэт... чаму ў Савецкай Беларусі ў вастрогах знаходзіцца больш беларусаў-грамадаўцаў, чымся ў Польшчы?“.

Апрача застрашваньня, у гэтых рэвэляцыях „Дня“ галоўнае аружжа—дыскрэдытацыя беларускай радыкальнай прэсы ў вочах працоўных гушчаў, жаданьне (бясьсільнае!) панізіць яе ў іх вочах, выставіць на від яе нібы правакацыйную работу,—каб на гэтым нарэшце выехаць... да Сойму.

Такім чынам паны Умястоўскі і Гурын спадзяюцца абавязкава папасьці ў Сойм. Гэтыя надзеі свае яны аргумэнтуюць сваею аддана́сьцю Ураду, які пэўна ж „паможа“ ім у гэтым. Іншымі аргумэнтамі панскіх наймітаў зьяўляюцца—застрашаньне працоўных гушчаў ды дыскрэдытаваньне працоўнае прэсы ў яе вачох.

На ўсю гэтую брудную, гадкую працу панскіх наймітаў, якія да таго маюць адвагу гаварыць аб сваей папярэдняй „карыснай“ працы, наймітаў, якія бізуном (бо-ж страшаць) зьбіраюцца заганяць працоўныя гушчы да галасаваньня за іх — мы лічым за нізкім для сябе адказваць, а зварочваемся з заклікам да беларускіх працоўных гушчаў— будзьце гатовы да выбараў, выкарыстайце вашае адзінае права паказаць сваю волю, бяз хістаньняў гатуйцеся стаць адзіным фронтам працоўных! Ганеце прэч усіх прадажнікаў, панскіх наймітаў і здраднікаў, якія хочуць на нашай нясьвядомасьці выехаць, каб пасьля нанова прадаваць нас! Будзем стойкімі!

## Няўдачы блёку нацыянальных меншасьцяў.

Абяцанкамі нацiскам і пагрозамі ўраду ўдалося зусім разьбіць агульны выбарны фронт жыдоўскіх буржуазных груп і партыяў. Замест адзінага выбарнага фронту пад сьцягам блёку нацыянальных меншасьцяў атрымаўся ня толькі поўны развал і дэзарганізацыя выбарнай кампаніі жыдоўскай буржуазіі, але і развал яе партыяў. Магутная ўплывовая арганізацыя жыдоўскіх рабінаў гэтак званая Агуда поўнасьцю адмежавала сябе ад блёку нацыянальных меншасьцяў ды мала таго актыўна, усей вагай свайго аўтарытэту выступіла проці яго. Арганізацыя жыдоўскіх рамесьнікаў выступіла проці; арганізацыя купцоў—гэтак сама. Мала таго разьбілася арганізацыя сіоністычнай партыі. Сіоністычная арганізацыя Галіччыны стала рашуча проці пастановы Цэнтральнага Камітэту Сіоністаў, ня кажучы аб прынцыповым адасабненьні Бунда.

Вось якая сітуацыя ўтварылася ў радах жыдоўскай буржуазіі. Аб пававе сітуацыі найлепш сьведчыць афіцыёз сіоністаў у польскай мове „Nasz Przegląd“. Польскія жыды разбегліся напросту на розныя стораны, як стада бяз пастыра, гнанае і заганянае абяцанкамі, тэрарызаванае пагрозамі і што раз выразьнейшымі злоснымі абвінаваньнямі.

Апамятаваўся афіцыёз, што іншыя яго партнёры не прадстаўляюць сабой цэлых народаў, а толькі нязначных страціўшых уплывы на шырокія масы працоўных буржуазных груп. „Мысьль утварэньня блёку меншасьцяў ня была на жаль зусім прааналізавана, ня толькі з поваду разыходжаньняў унутры жыдоўскіх, але таксама з поваду партыйна-палітычнага расслаеньня, якое зрабіла вялікія поступы сярод украінцаў, беларусаў і немцаў у працягу прайшоўшага пяцёхгодзьдзя“.

Адным словам выйшла мена вала ды на казла. Свой буржуазны фронт расстрэілі, галасы разьбілі, а на атрыманьне ад іншых мала, ох мала шансаў. Пад уплывам гэткай рэчаістнасьці ды яшчэ сумнейшых выбарных пэрспэктыў пачаліся разважаньні аб тым, што жыдоўская еднасьць „у сто разоў“ важней мандатаў. Упрост дзіву можна даццца гэткай раптоўнай прынцыповасьці. Аднак простым зазначэньнем факту „Nasz Przegląd“ не задаваляецца. Прадбачучы паражэньне, „Nasz Przegląd“ заклікае да безадкладнага шуканьня выхаду з стварыўшайся сітуацыі.

„Надыходзіць апошняя гадзіна, перад каторай трэба задумацца над магчымасьцю ратаваньня сітуацыі. Калі гэтая гадзіна праб'е —мы станем бяспомачнымі у абліччы катастрофы, з якой ужо ня будзем мець магчымасьці падняцца“.

Цікава, як Ц. К. сіоністаў будзе ратаваць сітуацыю? Ці тым, што скіне з сябе фартушок апазіцыі і выбярэ пакінуўшы блёк адкрыта санацыйную „жыдоўскую еднасьць“? Трэйцяга выхаду, ак бачым, няма. Бліжэйшыя пару тыдняў мусяць прынесьці ўжо адказ.

—•—

Па апошніх вестках з блёку выступае таксама „Ундо“ (Украінскае Нац.-Дэмакр. Аб'яднаньне) — можа насільнейшая з усіх групаў блёку!

# Выбарная хроніка.

## Сельсаюзьнікі з маной даходзяць да вар'яцтва.

(Замест фэльетону).

Як ведама, Ярэміч і Рагуля маюць паўтара чалавека сваіх прыхільнікаў, а мандаты ж трэба здабыць як небудзь. А на што-ж яны могуць разьлічаць, калі працоўная гушча лічыць іх здраднікамі? На аб'едкі. Яны ж увесь час думалі, што як толькі зьліквідуюць Грамаду, арыштам грамадаўскіх паслоў—дык усе 100.000 сяброў Грамады паваляць за імі ну і ясна, што ўжо наперад цешыліся з гэтага і пастараліся, як толькі маглі, каб упякаць грамадаўскіх павадыроў.

У адным іх жаданьні споўніліся: паслоў пасадзілі і хутка будуць іх судзіць; але ў другім—ня збыліся іх лятуценьні....... працоўная гушча і надалей гоніць іх з вёскі, як здраднікаў інтарэсаў працоўных. Хоць ты аб сьценку галавой, нічога не памагае. Але ад грамадаўскіх павадыроў астаўся абгрызак высмактаны і выкінены, у месца, куды наагул зьліваюць памыі і розную непатрэбшчыну. Цікава, што праз нейкі час акалалася, што месцам такім куды папаў грамадаўскі абгрызак—б. пасол Сабалеўскі Юры стаўся Сялянскі Саюз Ярэміча і Рагулі. Як галодны сабака за голую костку, ухапіліся яны за б. п. Сабалеўскага і пачалі крычаць: „за намі перамога, за намі ідзе ўся Грамада з б. п. Сабалеўскім на чале“, з тым самым Сабалеўскім, якога навет самі сельсаюзьнікі на зьезьдзе назвалі здраднікам. Але што-ж, на бязрыб'і і рак рыба. А паколькі працоўныя беларусы і надалей засталіся непарушнымі ў бок Ярэміча і Рагулі, дык пачалі яны шукаць больш грамадаўскіх абгрызкаў. На іх вялікі жаль больш іх не аказалася, дык прышлося шукаць розных іншых камбінацыяў ды пры помачы фантазіі ствараць розныя праэкты. Падумалі і сказалі: давай разаб'ем Грамаду. На колькі частак? Ну пакуль-што хоць на пяць, а там можа і на 25 разаб'ем, калі будзе патрэба. І ня доўга думаючы абвесьцілі ў сваім органе „Знаменітай Сялянскай Ніве“, што Грамада распалася на 5 (дасłоўна на пяць) частак, і што навет самая большась з іх у асобе б. п. Са-

Д. Рапэцкі.

# КАЛАСЫ.

Навячэраўшы салёнкі з расолам, Міхась аглядзіў крывавыя мазалі. Ён нядаўна вярнуўся з бежанства. Ніва, амаль не з канца ў канец зарасла тоўстым бярэзьнікам. Цяжка прыходзіцца працаваць, а тут—жонка, дзеці. Гэта яшчэ паў-бяды, але вось ліха,—падаткі. Зямля ляжыць адлогам. парасла, нат' няпрыгодная для пашы, а тут,—падатак за падаткам. Ня маеш? Дык на кавёнлы хлеб, ато і кароўка зарыкае ў апошні раз.

Хлеба няма ўжо ад самага Вялікадня, а да Пятра яшчэ два тыдні...

Міхась што вечара выходзіў на загуменьне, пацешыцца насьпяваўшым жыткам. Вылушчваў недасьпеўшыя зярняткі і дрыжачаю рукою клаў у рот, шэпчучы:

— Дзякаваць богу, зараз.

— Сёньня, як звычайна, Міхась выцер некалькі недасьпеўшых каласкоў, здунуў мякінку і паднёс дрыжачаю рукою да губ. Дзьве буйныя сьлязіны, бы боб, упалі на паднесеную руку з жытам.

— Эх—доля, доля... — вырвалася з вуснаў Міхася і быццам гук вечавога звона ўскалыхнула вячэрняя навeтра, разьбілася на цуркі і, падхопленае вячэрнім падзьмуўкам ветру, пакацілася ў-ва ўсе бакі.

Паправіўшы на люльцы драцяны абруч і напхаўшы зялёным тытунём, Міхась, пыхкаючы, бы цягнік, распластаўся на мяжы, між сваім і панскім полем.

— Вось так здаецца заснуў-бы на век,—зямелька маці так і цягне! — падумаў Міхась і заплюшчыў вочы, удыхаючы пяшчоты летняга вечара, упаў у забыцьцё.

Буйныя каласы насьпяваўшага жыта нізка кланяліся, як-бы здароваліся з Міхасём. Яны любоўна-любоўна схілялі свае доўгія галавы ўсё ніжэй і ніжэй, нагіналіся к самаму вуху Міхася і, штось паціху шапнуўшы, адскаквалі, як-бы палохаліся, каб хто не падслухаў, ці ня здрадзіў таямніцаў іх чароўнага шэпту.

Больш сьмялейшыя схіляліся надоўга і сваімі шорсткімі валасамі казыталі Міхася па твары, па шыі і надарыўшы шорсткі пацалунак, нязграбна ківаліся, як-бы на разьвітаньне. Быццам каханка, астаўляючы мілага на неакрэсьлены час, ківаючы пальцам кажа:

— Глядзі, даражэнькі, не балуй, а то...

Наляцеў усходні падзьмух ветру. Падобна мору захваляваліся жытняе поле. ціхі шопат каласоў зьмяніўся ў нейкі шматгалосы гом тысячнай таўпы. Узбунтаваныя хвалі шпарка беглі адна за аднэй, пераганялі таварак, капыціліся, падалі, на іх налятала другія і ў бяспамяцтве ляцелі наперад.

Перашкода!..

Пярэднія ўдарылі сваімі шырокімі грудзьмі, узьвіліся на дыбы, ударылі яшчэ раз і ўзьнемажэньні падалі. Набегшыя таваркі заступалі іх месца. Завязалася барацьба, падалі новыя ахвяры, новыя сілы заступалі іх. Бой кіпеў.

А зоры, падлюзгваючы, паказвалі адна другой на ўзбунтаваўшаеся шэрае жытняе поле. Некаторыя з іх слалі бунтаўнікам маўклівыя пацалункі, пры гэтым уважна сочачы, каб іх паступку не заўважылі другія.

Іншыя раўнадушна глядзелі, шырока вытарашчыўшы нязразумелыя вочы.

А яшчэ іншыя, кволыя целам і духам у пярэпалаху заплюшчвалі вочы, каб ня бачыць сьмяротнай барацьбы, каб ня бачыць таго, аб чым так часта думалі, чаго так часта лякаліся.

І толькі нямногія, чулыя сэрцам і розумам не маглі далей быць бесстароннімі глядзельнікамі; яны жадалі быць з тымі, што бароліся не на жыцьцё, а на сьмерць—за Прастор! за Волю!

Кінуўшы злосны пагляд у бок можнаўладных гаспадароў несправядлівасьці, ляцелі ўніз, уніз на зямлю. Але недаляцеўшы да зямлі, дзесь гінулі ў шэрай цемнаце ночы.

А, месяц? Месяц сачыў за ўсім.

Час ад часу, хмары закрывалі яго бляды твар, яны беглі чарадою, быццам авечкі ў сьпёку, то затрымоўваліся, то пераганяючы адна адну, беглі далей. А ён спрытна бегаў між іх касматым стадам.

Найшоўшы прарэху, выстаўляў ён свой бляды шыдэрна скрыўлены твар, палахліва перабягаў ад хмары да хмары. То выскакваў і ціха бег па чыстым цёмна-сінім скляпеньні начнога неба,—раўнадушна кідаючы халодны ледзяны пагляд. Шыдэрны сьмех часамі прападаў з яго аблічча і ён надоўга хаваўся за набегшую хмару.

— Бдзын-ннн... бдзын-ннн... бдзын-ннн...

— Гудзелі тоненькія галаскі камароў, пачуўшы вабны пах жывога цела.

— А, прапажа на вас!—пры гэтым Міхась так нелітасьціва хлопнуў сябе на лобе, што ад няўсьпеўшых зьляцець камароў, асталіся толькі чырвоныя плямы. Дастаўшы сярнікі, Міхась прыпаліў патухшую люльку і толькі густыя клубкі дыму час ад часу давалі знаць, што ён ня сьпіць.

Новы сільны парыў ветру гвалтоўна ўзбунтаваў, здавалася ўжо заціхаўшае мора жытніх каласоў. Спалеўшыя ад бунту хвалі ўзьвіліся на дыбы. Рвануўшыся ўправа, улева й шалёна рынуліся наперад.

Гора тым, што, спаткнуўшыся, упалі...

Усе, як-бы ў перапалоху, на хвілю замярло—застыла, нат' вецер,—прычынца бунту, як-бы ў перапалоху замёр. Толькі хвалі жытніх каласоў у шаленстве імчаліся, топячы ўсё папаўшае на сваім шляху.

На хвілю прыпыніўшыся вецер, закруціў, засьвістаў... Штось застагнала, завыла, быццам зранены зьвер.

І быццам па загаду невядомага чараўніка ўсё сьціхла.

Стала ціха—ціха.

Каласы, хвалюючыся, штось таемна шапталіся.

Адзін нагнуўся к самаму вуху Міхася і дакорліва шапнуў:

— Нявольнік...

Міхась пыхнуў вобалакам дыму, затаіў дух,—прыслухаўся.

— Нявольнік... Нявольнік... Нявольнік!..

Усё мацней і мацней чуўся гоман у начынаўшым супакойвацца моры каласоў.

— Хто я?—Ляніва заварушылася гэткае пытаньне ў галаве Міхася. Ён расплюшчыў вочы, зрок яго спаткаўся з шыдэрным усьмехам месяца. Як падняверaны, Міхась ускочыў на ногі, пытлівым паглядам абвёў поле, як-бы шукаючы адказу і, не знайшоўшы, падумаў:

— Ня можа быць!..

— Нявольнік! Нявольнік! Нявольнік!..—чулася са ўсіх бакоў, быццам гэта было ня поля з насьпеваўшым жытам, а—веча...

— Я!—Маланкаю мільганула ў галаве Міхася і, як абліты варам, ён стаў азірацца кругом, яму стала страшна-страшна; ён адчуваў, як бегла кроў па кожнай жылцы яго цела. Яму здавалася, што вось-вось разарвуцца грудзі і выскачыць сэрца, біўшаеся, як злоўлены дзік. У нейкім шалёным танцы ўсё захадзіла кругом Міхася, ён хацеў рвануцца, уцячы, але нейкая таёмная сіла моцна прыкоўвала яго.

Шал ахапіў Міхася.

— Не!—Бы гром вырвалася з яго грудзей і рассыпаўшыся пакаціліся ўдаль, патрасаючы начную ціш—летняй ночы.

— Ад сёньня—не!..—Дадаў ён і, моцна рвануўшыся, быццам разарваў кайданы, так моцна трымаўшыя яго, шпаркім крокам пайшоў уздоўж мяжы.

Шыдэрны сьмех прапаў з халоднага аблічча месяца; ён ніяк ня мог уцяміць, што магло так узварушыць дасюль ня чулага Міхася.

балеўскага, pardon на чале з паслом Сабалеўскім, прылучылася да Сельсаюзу.

Дык вось якія праекты Ярэміча і Рагулі на бліжэйшую будучыню. Але праекты іх так і застануцца праектамі, самі сельсаюзьнікі так і застануцца з грамадаўскім абгрызкам б. п. Сабалеўскім з самім сабой на чале, а жыцьцё пакажа іншае: б. грамадаўцы ня йдуць у сельсаюз, хоць тым у лоб страляй!

Вынік аж усяго гэтага той, што Ярэміч і Рагуля выдалі праект аб развале б. Грамады (яна-ж здаецца ўжо даўна зьліквідавана: Ярэміч і Рагуля прылажылі да гэтага сваю руку — дык няма аб чым гаварыць здавалася-б) падпісалі яго і надрукавалі ў той-жа „званянітай Сялянскай Ніве“ пад загалоўкам „Разгром б. Грамады“.

Шмат людзей церпіць ад псыхічнай хваробы, што завецца маніяй. У некаторых гэта хвароба выяўляецца ў маніі вялічча. Гэта ёсьць і ў Ярэміча і ў Рагулі, але да гэтага ў іх далучылася манія разгрому Грамады. Але, як ведама, людзі з маніяй ці маньякі, як іх называюць, зьяўляюцца не нармальнымі і найчасьцей канчаюць домам вар'ятаў. Дык глядзіце каб з Рагуляй і Ярэмічам так ня сталася!

### Манархісты хочуць папасьці ў „беспартыйны“ блёк Пілсудзкага.

Як падае манархічнае „Słowo“, марш. Пілсудскі прыняў князя Януша Радзівіла, які, як делегат ад манархістаў, дамагаецца места для манархістаў, па сьпіскам кандыдатаў „беспартыйнага“ блёку. Відаць, ні лесам, ні сенажацямі, ні пашаю, ні нагрозамі ўжо нямогуць нашы абшарнікі падкупіць беларускіх сялян, каб тыя галасавалі за іх, дык пашлі шукаць помачы ў свайго сяброўніка Пілсудзкага.

### Манархісты аб Грамадзе.

Манархісты асобна ад сельсаюзьнікаў надзялілі „нябожчыцу“ Грамаду на тры часткі. Цешаць яны сябе тым, што б. Грамада не карыстаецца больш уплывамі на вёсцы. Але ўсё-ж не асьмельваюцца казаць, што б. Грамадаўцы ідуць за імі, як гэта робяць сельсаюзьнікі.

---

**СЯЛЯНЕ і РАБОТНІКІ!** Падавайце рэкламацыі аб унясеньні сябе і сваіх родных і знаёмых у сьпіскі. Як гэта рабіць, прачытайце ў папярэднім нумары „Думкі Працы“ і гэтыя рэкламацыі.

# Новы падарунак з турмы п. Ярэмічу і К°.

## Пісьмо у Рэдакцыю.

*Паважаны Грамадзянін Рэдактар!*

Мы ніжэйпадпісаныя вязьні - беларусы Беластоцкага вастрогу просім рэдакцыю зьмясціць у сваёй газэце наступнае пісьмо:

Прачытаўшы ў № 1 „Права Працы“ пісьмо вязьня Гарадзенскага вастрогу Данілы Рапэцкага, мы, палітычныя вязьні-беларусы Беластоцкага вастрогу, былі маральна вельмі здаволены з гэтага пісьма, бо зьмест яго ёсьць праўдзівым адбіткам нашых настрояў—паглядаў адносна Ярэмічавага „патранату“ для палітычных вязьняў. Апрача таго, мы на мужыцкай прастаце сваёй думалі, што такое пісьмо—падзяка адабе усім ахвоту паном Ярэмічам і К° няпрошана рашчыняць сваю апеку над палітвязьнямі-беларусамі. Але сталася інакш: як відаць, некалькі-летняя служба ў панскай дэфензыве кумпаніі не прайшла дарма, бо зрабіла іх усім праўдзівымі ашуканцамі. Ужо праз кароткі час у № 92 „Сял. Нівы“ мы прачыталі адказ вязьню Рапэцкаму, у якім паны „паважаныя“ дыпломаты ў поўнай меры выявілі сваё мастацтва. Памятаючы добра старую расейскую пагаворку — „Где сілой взять нельзя, там надобна ўхватка“, ці прасьцей кажучы: хітрасьць і подступ, яны, затаіўшы сваю люта воўчую злосьць, са спакоем праўдзівых філёзафаў, абдумаў—Пілатаў кажуць: „Айцец, даруй яму, бо ён ня ведае, што робіць“, а далей гавораць: „Вы бедныя-хворыя... мы ня можам вінаваціць яго, бо добра ведаем, што ня ён вінават у гэтым... вінават той, хто давёў Рапэцкага да гэтага маральнага раскладу“. Ня шкодзіла-бы, паночкі, каб гэтак да вашае вялікадушнасьці ды мудрасьці дадаць крыху шчырасьці, дык напэўна прыйшлося-б далучыць і сябе да ліку „тых“ (вінаватых у раскладзе Рапэцкага) і выйшла-бы ў Вас тады „мы“, але відаць, паночкі, Вам трудна і ўлеўніць такое зьявішча, як адказ ад панскае ласкі — „надачкі“, за якія Вы самі так верна служыце сваім паном. Вы ня можаце зразумець абурэньня зьбалелай, зьняволенай душы палітвязьня і ня можаце зразумець, што такая прапазыка, як арганізаваньне „патранату“ праз Вас ды яшчэ надчас выбарнай кампаніі, зьяўляецца новай, яшчэ большай для яго зьнявагай.

Няўжож Вы запраўды думаеце, што мы не разумеем Вас і пойдзем на такую прынаду? Мыліцеся, паночкі. Ведайце, што разумеем мы ўдобра Вас, разумеем, што ходзіць Вам тутака не аб папраўве нашага жыцьця ў вастрозе, але аб папраўве, аб палажаньні сваёй маскі, якою прыкрываеце Вы свае запраўднае абліччa, ад надмернага ўжываньня якое дашчэнту зьдзерлася і страціла сваю аблудную ахварбоўку. Надарма, паночкі, Вашыя стараньні, на такія рэчы як ваша прапанова стварыць беларускі патранат... не абурацца—Мы з свайго боку прапанавалі-бы Вам пакінуць лепей усе спробы закідваньня сваіх сецяў у нашы вастрожныя воды, бо можам Вас запэўніць, што ўсё роўна нічога ў іх ня зловіце, за выняткам можа адзіночных „рачкоў—паўзуноў“ у моц законаў прыроды, льнучых за „сваіх“, як гэта Вам удалося на Лукішках. Цешцеся, што з-за кратаў мы ня можам Вам „шкодзіць у Вашай працы“ і выбачце нам нашу „нячуласьць і няўдзячнасьць за Вашы добрыя замеры“.

Беласток—турма 26/XII—27 г.

Падпісы: М. Равязкі, В. Казлоўскі, П. Попка, Ю. Ковалеўскі, Язэп Радужаў, Я. Стральчук, Ул. Герн, П. Назарук, Трафімюк І., М. Астравецкі, А. Шпаковіч, Стойко, П. Шпаковіч, А. Журко, П.Ваўкавыскі, Жукоўскі, У. Рамачук, Я. Вярбіцкі, А. Ковальцэвіч, Н. Крыштаф, Васіліса Комар, Аляксандра Ульвіцка, Кутнэм Карп, А. Сенькевіч, Ф. Калодко, Іван Хвядчэня і Я. Буйко.

**Ад Рэдакцыі.** Што скажаце няпрошаны патрон вязьняў, п. Ярэміч? Па вашаму—ў турме сядзяць людзі глупенькія, якіх можна ашукаць двойчы—даносамі на іх садзячы ў турму і робячы „ласкавы жэст“ з выстаўленьнем свайго „патронату“? Чым-жа вы лепшы за гэтых п. п.-оў розных судзьдзяў, якія стварылі свой „патранат“? Позна толькі задумалі рабіць патранаты п. Ярэміч! Вы другое рабілі, калі сядзелі ў мінулым Сойме. Не ашукаеце й цяпер!

Алесь Салагуб.

## О, браты!

О, сябры! о, браты!
Што прымкнулі раты?
Змоўк што покліч сьвяты
— О, сябры! о, браты!
Ці-ж у сэрцах у вас
Ясны промень загас
І няма цеплаты?
— О, сябры! о, браты!
Ці-ж выпадкі тых дзён
Навялі на вас сон
І пад шмэр цемнаты
Вы сьпіцё?—О, браты!
О не, вы ня сьпіцё,
А вось так—жывяцё,
Як жукі, ці краты.
Але як?—О, браты!
Страх за скуру пэўчае
Змусіў „гонарна“ вас
Прытуліць хвасты
— Вось дык гонар, браты!
І праз гэта відаць
Пачалі вы ўцякаць
З гэтых мас—галаты
— Ці-ж так гэта? браты!
І хаваецеся,
Ды чураецеся
Грамады—бедаты.
— Ці-ж ня брыдка? браты!
Сорам, ганьба заўсім
Перад сьветам усім;
З-за такой брыдаты
— Вы мяне больш не браты!

* * *

Згодней, вышэй
Угору, браты!
Пад зоры, пад сонца,
Пад сьвет залаты.
Хоць кожнага крыж
Зацяжкі ў барацьбе,—
Змагайся, нядайся
Паходаць сябе.
Вышай, вышай!—
Высілак адзін—
Пад сеньню аблакоў
На шчыце спачын.
Там зваліцца цяжар
З збалелых плячоў,
Там сьцяг свой народні
З другімі ўмацні!

---

Форма рэклямацыі за сябе.

**REKLAMACJA.**

**Do Okręgowej Komisji Wyborczej w . . . . . . . . .**

(Imię i nazwisko), zamieszkały w . . . . . . . . . . . uprasza . . . . . . . . . . o zamieszczenie go w spisie wyborców do Sejmu i Senatu (miasta) . . . . . . . . . . . . . gminy . . . . . . . . . ., gdyż jak wykazuje załączony (poświadczony odpis dowodu osobistego, paszportu rosyjskiego, wyciągu z ksiąg ludności, książeczki legitymacyjnej, dokumentu wojskowego, książki meldunkowej i książki robotniczej), podpisany liczy lat . . . jest obywatelem Rzeczypospolitej Polskiej, z zawodu . . . . . . . . . i mieszka od dnia . . . . . . . . . . 192 . . r. (w mieście) . . . . . . . . . . (gminy) . . . . . . . . . . , a nie jest wedle obowiązujących ustaw pozbawiony prawa wyborczego.

Miejscowość . . . . . . . Podpis . . . . . . . . .

Data . . . . . . . .

У рэклямацыі трэба зазначыць толькі той дакумэнт, які ёсьць у асобы, якая дамагаецца ўнясеньня яе ў сьпіс; так напрыклад, калі маецца „довод особісты“, то пішацца „załączony poświadczony odpis dowodu osobistego . . .“, а ўсё далей ня пішацца да слоў: „podpisany liczy lat . . . да рэклямацыі далучаецца копія дакумэнту, пасьведчаная сьвяшчэньнікам, гмінаю, ці якою-небудзь урадаваю ўстановаю.

Форма рэклямацыі за іншых асоб

**REKLAMACJA.**

**Do Obwodowej Komisji Wyborczej w . . . . . . . . .**

(Imię i nazwisko), zamieszkały w . . . . . . . . . . uprasza . . . . . . . . . . o zamieszczenie go, mieszkańców wsi (miasta) . . . . . . . . . . . . . . (takich to) w sprawie wyborców do Sejmu i Senatu (miasta) . . . . . . . . . (gminy) . . . . . . . . gdyż oni liczą ponad 21 rok, są obywatelami Rzeczypospolitej Polskiej i mieszkają stale we wsi (mieście) . . . . . . . . . . . (gminy) . . . . . . . . . ., a nie są wedle obowiązujących ustaw pozbawione prawa wyborczego.

Miejscowość . . . . . . . Podpis . . . . . . . . .

Data . . . . . . . .

Форма рэклямацыі проці ўнясеньня ў сьпіс асоб, ня маючых выбарчых праў.

**REKLAMACJA.**

**Do Obwodowej Komisji Wyborczej w . . . . . . . . .**

(Imię i nazwisko), zamieszkały w . . . . . . . . . . uprasza . . . . . . . . . o wykreślenie ze spisu wyborców do Sejmu i Senatu (miasta) . . . . . . . . . (gminy) . . . . . . . . . (takich to) . . . . . . . . . . gdyż oni (даваьці факты, чераз што яны ня маюць права быць унесены ў сьпіскі).

(Мясцовасьць) . . . . . . (Подпіс) . . . . . .

(Дата) . . . . . . .

---

# Палітычная хроніка.

## У Польшчы.

### Блёк Пяста і Хадэцыі.

У сераду 4/I. адбылася паседжаньне Галоўнай Управы Пяста, на якім пастаноўлена стварыць блёк з Хадэцыяй. На блёк з Эндэцыяй няма жаднага намёку.

У чацьвер 5/I. адбылася паседжаньне Галоўнай Управы Хадэцыі, на якім вынесена наступная рэзалюцыя: „Галоўная Управа Хрысьціянскай Дэмакратыі ўпаважняе Прэзыдыум увайсьці ў блёк з Пястам“.

Далей Галоўная Управа ўпаважняе да далейшых перагавораў аб пашырэньні гэтага блёку, згодна з думкамі „пастырскага“ ліста біскупаў. Як бачым, хадэцыя выказвае жаданьне да ўключэньня ў гэты блёк і эндэкаў. Пяст аднак, як бачна з усяго, на гэта ня згодны ў зьвязку з палітычным банкруцтвам эндэцыі.

### Далейшы развал Пяста.

У Заверці (Келеччына) адбыўся павятовы зьезд Пяста. Зьездам заўладалі ды распусьцілі яго староньнікі Бойкі.

У Стопніцы (Келеччына) адбыўся павятовы зьезд мужоў даверыя Пяста. Зьезд цалком перайшоў на бок Бойкі.

Адбыўшыяся павятовыя зьезды Пяста ў Кельцах і Улжы аднагалосна прынялі рэзалюцыі аб супрацоўніцтве з урадам і аб уступленьні ў „Zjednoczenie Ludu“ Бойкі.

### Хадэцкая прэса аб уплывах Пяста.

Хадэцкая прэса, абгаварываючы настрої вёскі, адзначае, што моладзь падатліва на Бойкаўскую агітацыю ў той час, як старэйшыя трымаюцца за Вітаса.

Гэтае скрытае прызнаньне ўдач Бойкаўскай акцыі з уст саюзьнікаў Вітаса вельмі дрэнна сьведчыць аб выбарных шансах Вітаса.

### Капітуляцыя жыдоўскай „апазіцыі“ ў Галіччыне.

Выходзячы ў Львове орган сіоністаў „Дэр Морген“ перададзены староньнікамі блёку ў рукі староньнікаў адкрытай немаскаванай угоды, ідучай паміма блёку нац. меншасьцяў. Цікавы спосаб барацьбы.

### Бунд у Заходняй Беларусі.

У Вільне ўтварыўся выбарны камітэт Бунда на места Вільню і ваколіцы. У выбарных акругах Заходняй Беларусі Бунд пойдзе зусім самастойна.

### Нарады Зубраў.

Адбылася нарада Галоўнай Рады „Prawicy Narodowej“, пад старшынствам Януша Радзівіла (Несьвіж). Па заслуханьню рэфэратаў Галоўная Рада прызнала дагэтуляшнюю палітыку, ведзеную праз прэзыдыум, добрай.

На паседжаньні „Komitetu Zachowawczego“ (выбарная крамка зубраў Рэд.) усталены кандыдаты зубраў. Галоўнымі кандыдатамі, як падае „Głos Prawdy“, будуць: Януш Радзівіл, праф. Кшыжаноўскі, Ярош, Эўстахій Сапега.

### Канфэрэнцыя рэдактароў зубраўскіх газэт.

Як паведамляе „Głos Prawdy“, у Варшаве адбылася канфэрэнцыя рэдактароў кансэрватыўных газэт з усёй Польшчы. На канфэрэнцыі пастаноўлена навязаць цесны кантакт між рэдакцыямі кансэрватыўных газэт, каб узгодніць інфармацыйную і публіцыстычную працу. Найбольш часу заняло абгутарэньне заданьняў кансэрватыўнай прэсы ў часе выбараў.

У канфэрэнцыі бралі ўдзел радактары 6 газэт: „Dnia Polskiego“ (Варшава), „Słowa“ (Вільня), „Dziennika Poznańskiego“, „Hasła“ (Лодзь), „Czasu“ (Кракаў) і лодзінскага тыднёвіка „Prawda“.

### Поўная згода ў Львове.

Санацыйны „Głos Prawdy“ паведамляе, што доўгачаканая згода ўсіх буржуазных польскіх партыяў у Львове стараньнямі графа Баркоўскага нарэшце дасягнута. Апрача жўна санацыйных груп, як: Партыя Працы, Zjednoczenie Ludowe (Бойка), Stronnictwo Chłopskie, Кансэрватысты (зубры), Naprawa Rzeczypospolitej у гэты выбарны блёк увайшла і „апазіцыя“: Пяст і Хадэцыя. Толькі адны Эндэкі надалей гуляюць ў апазіцыю.

### Нарады ваяводаў.

У Варшаву, у справе выбараў зьехаліся аж цэлых 6 ваяводаў: Наваградзкі, Беластоцкі, Люблінскі, Келецкі і Лодзінскі.

### Плата за працу ў Выбарных Камісіях.

З прычыны неахвотнага выкананьня сваіх абавязкаў членамі раёных выбарных камісіяў, што можа ад'емна адбіцца на прадвыбарнай працы, міністэрства ўнутраных спраў прыгатаўляе распараджэньне аб плаце за працу і зварочце коштаў падарожы для членаў раённых выбарных камітэтаў.

### Закрыцьце ўладай Сокала ў Скавіне.

„Газ. Варш.“ № 5 паведамляе, што ў Скавіне па загаду Кракаўскага ваяводы прыбыла паліцыя, апячатала памешканьне спартыўнага таварыства Сокал і распусьціла (зачыніла) само таварыства. Упраўляючым спадчынай па таварыству назначаны Лудвікоўскі, выключаны ў прошлым годзе з Сокала. Гэты пан Лудвікоўскі ў блізкіх адносінах да начальніка мясцовага „Strzelca“, які вельмі ахвочы на салю Сокала і горача стараецца аб крэдытах для куплі цэлага будынку.

### Суд над камуністамі.

Акружны суд ў Лодзі прыгаварыў 18-ці летняга Флембельца на 2 гады турмы і Валашчыка на 3 гады турмы за прыналежнасьць да камсамола.

## Заграніцай.

### „Міратворчая Амэрыка“...

Амэрыканскі ўрад, як мы ведаем, толькі што зьвярнуўся да Францыі і да іншых дзяржаваў з прапазыцыяй — заключэньня агульнага і супольнага трактату вечнага міру, абвяшчаючага вайну агідным праступленьнем.

Але-ж—імпэрыялістычная амэрыканская буржуазія, — аднэй рукой надпісаўшая свой „маніфэст — прапазіцыю“ вечнага міру, другой — зараз-жа кінула на канчальны падбой маленечкай незалежнай Рэспублікі Нікарагуа значныя ваенныя сілы — паветранага і вадзянога флёту. Адначасна кінуты ваенныя сілы і ў другую суседнюю рэспубліку Манагуа якая таксама... патрэбна Амэрыцы, як і Нікарагуа — для яе — сусьветнай палітыкі...

Але, каб усё выглядала неяк „прызваіцей“, у абедзьвюх рэспубліках былі справакаваны новыя выбухі „рэвалюцыі“, якія і пасланы „зьліквідаваць“ амэрыканскія войскі...

Як ведама, у нашы пасьляваенныя — фашыстаўскія—часы імпэрыялістычныя ўрады зусім перасталі сьціснязца...

### „Рэпарацыйны агент“ у Амэрыцы.

Агент „саюзных дзяржаваў“, які назначаны, каб наглядаць за выкананьнем Нямеччынай „пляну Доўса“ — у справе адшкадаваньняў, паехаў з дакладам у Амэрыку. Там ён радзіцца з прэзыдэнтам Куліджам, міністрам скарбу Мэлонам і кіраўнікамі найважнейшых амэрыканскіх дзяржаўных і прыватных банкаў — ня толькі ў справе нямецкіх адшкадаваньняў ды крэдытаў, але і наагул— у справах эўрапэйскіх даўгоў Амэрыцы.

Эўрапэйская прэса, асабліва — француская, — страшэнна зацікаўлена гэтымі нарадамі Паркэра з амэрыканскімі фінансістамі—валадырамі Эўропы. Амэрыканскія газэты пішуць, што ўрадавыя і фінансавыя колы Амэрыкі далучаюцца да высунутай Паркэрам думкі — аб пераглядзе „пляну Доўса“, але толькі — рашуча адмаўляюць вязаць палёгкі Нямеччыне з нейкімі ўступкамі „саюзьнікам“ у справе ваенных іх даўгоў Амэрыцы...

Аб гэтым у бліжэйшыя дні амэрыканскі ўрад мае выдаць афіцыяльны камунікат.

## Новы праект—„лігі вялікіх дзяржаваў“.

(Яшчэ ў справе „мірнай прапазіцыі“ Амэрыкі)

Цяпер газэты больш высьветлілі, у чым зьмест прапазіцыі амэрыканскага міністра замежных спраў — „аб вечным міры“ паміж дзяржавамі. Аказываецца, што амэрыканскі ўрад прапануе вечны мір толькі паміж вялікіх дзяржаваў. Толькі вялікія дзяржавы маюць заключыць супольны трактат, выключаючы між імі стан вайны Гэткім чынам, амэрыканскі імпэрыялізм. зусім навет ня лічыць запраўднай вайной—„вайну“ між вялікай дзяржавай і малай... Напрыклад, — між Амэрыкай і Нікарагуа ці якой навет Мэксыкай... А калі гэта — зусім не вайна, дык значыць яна — дазволена... Бо ніякай рызыкі для вялікай дзяржавы не прадстаўляе...

Гэтую „мірную прапазіцыю“ амэрыканскай буржуазіі трэба лічыць — запраўдным і адкрытым маніфэстам сусьветнага імпэрыялізму, на чале якога выразна становіцца наймагутнейшая ў сьвеце вялікая дзяржава, прапануючы ўсім іншым—стварэньне хаўруса ўзаемнай дапамогі ў справе падбою малых дзяржаваў.

Дзіўна разьбежныя галасы ў прэсе іншых імпэрыялістычных дзяржаваў спаткала прапазіцыя амэрыканскага ўраду.

Прэса Францыі, якая ў Лізе Нацыяў спэцыялізавалася на „абароне правоў малых дзяржаваў“ (будуючы на іх галасох сваю ваенную гэгемонію ў Эўропе...), спаткала прапазіцыю Амэрыкі „халодна“, бачучы ў ёй — „падважываньне Лігі Народаў“... Прэса Англіі, якая—пэўне-ж — ня можа адмовіцца ад свайго ўсьцьж рыхтаванага праекту вайны проці аднэй вялікай дзяржавы, таксама скэптычна (з недаверыем) адняслася да „мірнага пачыну“ Амэрыкі, пазываючыся на крыўду Лігі Нацыяў, у якой ангельскі імпэрыялізм мае такую сільную руку...

Але ж і Японія, якая таксама толькі-што мае распачаць вялікую вайну проці свайго суседа Кітаю, таксама — стрымана прыняла пачын Амэрыкі, заявіўшы, што сьпярша—да адказу на прапазіцыю — трэба высьветліць, у якім зьвязку мае быць новы Трактат „міру“ з Лігай Нацыяў.

Дык трэба думаць, што пакуль-што прапазіцыя Амэрыкі—„павісьне ў паветры“... —Бо-ж запраўды,—ці ж трэба вялікім дзяржавам голасна маніфэставаць сваю жываедзкую сыстэму адносна да малых народаў, якіх яны і без „рачыстага мірнага трактату“, навет ня гледзячы на Лігу,—глытаюць, калі патрэбна,—без цэрэмоніі.

Гэткім чынам амэрыканскі праект—стварэньня „Лігі Нацыяў“—выключна для вялікіх дзяржаваў, як залішне адкравенны, будзе адкінуты: вялікіп дзяржавам выгадней крывадушна камандаваць малымі—у супольнай з імі—агульнай „Лізе Нацыяў“.

## Нямеччына—хутчэй, як Польшча...

Пакуль, што Вальдэмарас неяк не сьпяшыць выконываць „раду“ Рады Лігі Нацыяў адносна да распачацьця перагавораў з Польшчай — у справе ўзнаўленьня ,нармальных стасўнкаў, торговага дагавору і г. д. Але вось Нямеччына дык неяк бяз Рады Лігі дала сабе рады з Вальдэмарасам.—Хутка падрыхтаваўшы—каб папярэдзіць Польшчу — што патрэбна, нямецкая дыплёматыя дабілася таго, што Вальдэмарас у бліжэйшым часе сама едзе ў Бэрлін, каб распачаць, можа хутчэй—ужо і падпісаць там ужо гатовы торговы трактат з Нямеччынай... Тады пры перагаворах польска-літоўскіх Польшчы прыдзецца ўжо лічыцца—з усімі варункамі, якія будуць зафіксаваны ў літоўска-нямецкім трактаце...

## Новыя выбары ў-ва Францыі.

Новыя выбары ў-ва Францыі маюць, як думаюць газэты, адбыцца — паміж 22 і 29 красавіка г. г. Урад яшчэ не ўстанавіў дакладна даты выбараў.

## Урадавы крызіс у Латвіі.

Урадавы крызыс у Латвіі ўсьцяж цягнецца. Новага ўраду ня здолеў неяк стварыць і павадыр умераных сацыялістаў Гольнманіс, які зрокся дручэньня прэзыдэнта. Тады прэзыдэнт зьвярнуўся да прадстаўніка „дэмакратычнага цэнтру“. Калі і гэтая група ня створыць ураду, тады, трэба думаць, прэзыдэнт распусьціць Сойм, каб рабіць новыя выбары.

## Цікаўныя „рэвэляцыі“.

Мы паведамлялі нашых чытачоў аб скандале—з ваеннай кантрабандай (некалькі дзесяткаў вагонаў з кулямётамі — замест сельска-гаспадарчых машынаў...), якая была выслана з Італіі ў Вэнгрыю, але раскрыта на транзытным шляху аўстрыяцкімі мытнымі ўрадоўцамі на вэнгерскай граніцы.

Вэнгерскія ўлады — ня выдалі ваеннага транспарту аўстрыяцкім урадоўцам. Аўстрыяцкія дзяржаўныя ўлады заявілі рашучы пратэст. Узварушылася ўся Малая Антанта, якая пастаўлена Вялікай Антантай—жандармам над Вэнгрыяй, каб трымаць яе—безаружнай ды безбароннай. Вэнгерскаму ўраду прышлося адказываць... Дык ён і... адказаў, што гэты транспарт ваеннай кантрабанды ад Мусолінi—трафіў у Вэнгрыю памылкай—бо быў адрэсаваны ў Польшчу... Прышлося адказываць на скандальную „рэвэляцыю“ „здвечна-прыязнай Вэнгрыі“ і польскаму ўраду, які — рашуча адкрыжаваўся таксама ад раскрытай кантрабанды...

Так „афіцыяльна“ і астаецца нявысьветленым, каму з сваіх паўночных прыяцеляў дабрадзей Мусоліні паслаў у падарачак некалькі дзесяткаў вагонаў з кулямётамі — з гвалтам над „існуючымі трактатамі“, які ўсё так бароняць, калі яны кажуць аб правох, і так—абыходзяць, калі тыя кажуць аб абавязках...

Але ўсё-ж такі вэнгерскі фашыстаўскі ўрад мусоліняўскія кулямёты затрымаў у сябе—„да высьвятленьня справы“... на Страшным Судзе...

## Скіраваньне большай увагі Маскоўскага Інтэрнацыяналу на англійскую Індыю.

Выканаўчы Камітэт Маскоўскага Інтэрнацыяналу пастанавіў усіліць працу камуністычных агітатараў у ангійскай Індыі і Афганістане. У Афганістан будзе перанесена цэнтраля камуністычнай акцыі ў Азіі, якая дагэтуль знаходзілася ў Кітаі.

Так прынамсі паведамляе „Усходняе Агенцтва“, да вестак якога заўсёды трэба адносіцца асьцярожна.

# Наша хроніка.

**„З Работніцка-Сялянскага Аб'яднаньня“.** Як нам перадаюць, Выбарны Камітэт „Работніцка-Сялянскага Аб'ядначьня“ вядзе падгатаваўчую працу па арганізацыі мясцовых камітэтаў і падгатаўляе выбарныя лісты. Мае ў хуткім часе выйсьці орган „Аб'яднаньня“.

**Паляваньне ці санацыя?** Ад пэўнага часу пачала выходзіць у Вільні газэта „Народ“ — „ворган беларускае сялянскае партыі“, партыі, якая ўтварылася ў выніку расколу ў Ярэмічаўскім „Сельсаюзе“ і кіраўніком якое зьяўляецца др. Я. Станкевіч. Беларуская радыкальная прэса пільна сачыла за новым кірункам думкі, спадзяючыя бачыць у ім хоць пэўны нахіл у бок запраўднае абароны інтарэсаў працоўных. Дасюль выйшла аж шэсьць нумароў газэты (лічучы сюды № 1—1928 г.) — аднак, што да зьмены ідэалёгіі „воз и ныне там“, як кажа Крылов. Калі мы бачым у гэтым „воргане“ крытыку сваіх ранейшых аднапартыйцаў — дык гэта была крытыка толькі асобаў, ніколі ідэалёгіі. Новы орган, разглядаючы працу левых беларускіх арганізацыяў, тлумачыць іх пасьпех у гушчах іх беларускасьцю... і блізка што гэтым. Незразумелым неяк зьяўляецца ў новым органе і рэкляма люазей, якія ведамы, як праціўнікі ідэалёгіі працоўных гушчаў.

Што-ж гэта ўрэшце — паляваньне ці звычайная санацыя Ярэмічаўскага „Сельсаюзу“?

Больш усяго данных за апошняе.

Усё-ж пачакаем яшчэ выяўленьня ідэалёгіі, якую кіраўнікі новай партыі і органу так пільна хаваюць „пад хвартушком“.

**Яшчэ адна прадвыбарная крамка развалілася.** Як нас паведамляюць, эсэр Мамонька, які ня так даўно разам з „вядомым“ з сэймавай, а хутчэй поза сэймавай працы Аўсянікам—хацеў заваяваць на выбарах Заходнюю Беларусь—рашыў адмовіцца ад акцыі, прадбачучы яе поўны правал. Ну, што-ж? Хоць чэсьней выйшаў, як іншыя.

**„Сялянскай Ніве“ бракуе карэспандэнтаў.** Апошні № 3 (150) „Сялянс. Ніва“, поўны маны і дэмагогіі, поўны самарэклямы і пахвальбы, што за ёю ідуць працоўныя масы—урэшце ўсё-ж выдае сябе. Аказваецца, што „Сялянскай Ніве“ бракуе карэспандэнтаў, аб чым красамоўна сьведчыць абвестка „Да ведама карэспандэнтаў“. Як гэта належыцца, гэта няпрыемная для здрадніцкага органу вестка аб атсутнасьці на вёсцы людзей, якія-б хацелі жыць думкамі прадажнікаў інтарэсаў працоўных—абвернена ў ватр і зашыта абдуманым фактам новага павялічэньня фармату газэты. Як гэта ўсё-ж няўмела прыкрыта.

Для нас гэта зьяўляецца найважнейшым доказам, што ўсе папярэднія пахвальбы—толькі рэклямы нанятых пісакаў. Бо ж каму ахвота дзяліцца думкамі з агентамі міжнароднай буржуазіі, спэкулюючымі на народных інтарэсах?

**„Chryścijanskaja Dumka“.** Нашы хрышчоныя дэмакраты, прадаўшыся міжнароднай буржуазіі, разбагацелі і пачалі выдаваць новую часопісь пад вышэйпрыведзеным загалоўкам. Гэта хутчэй—прадвыбарная думка нашых клерыкалаў, ці карацей — „крыніца“, пакрытая ружовай вокладкай. Два вершы, дзьве ідэолёгічныя стацейкі, пераклады расказік ды адзін яшчэ арыгінальны: рэшта карэспандэнцыі, закончаныя аддзеламі: „З жыцьця рэлігійна-касьцельнага“, „Палітычны агляд“, „Усячына“ і іншымі прыдаткамі. Рэдактар-Выдавец — „сам“ ксёндз Адам Станкевіч, які свой подпіс ukвяціў красамоўнай дапіскай: „Z dazwołu J. E. Wilenskaha Katalickaha Arcybiskupa-Mitrapalita“. „Канец — дзелу вянец“ — кажа пагаворка. Вось-жа, судзячы толькі па „вянцу“—можна мець зусім нядвухзначнае ўяўленьне, не разглядаючы самай часопісі, чым зьяўляецца яна для працоўных масаў, інтарэсы якіх, скажам такі проста духоўным айцом—зьяўляюцца для нас першым і найгалаўнейшым крытэрыем ацэнкі і літэратурных твораў, ня кажучы ўжо аб салаўіных і салодкіх песьнях прадвыбарнага органу, якім фактычна зьяўляецца новая часопісь.

Ня ўсё мы можам прывітаць, што зьяўляецца друкам у сьвет—пабеларуску, як гэта ня так даўно рабілася. Праглядзеўшы артыкулы — можам канстатаваць большую напускную пабожнасьць нашых клерыкалаў, якія такім чынам у асобе галоўнага кіраўніка каталіцкай хадэцыі—ідуць на шлях сьвядомага зацьменьня галоў сялянскіх аджытымі праўдамі, якімі звычайна карыстаюцца ворагі працоўных для абдурваньня іх.

Што-ж гэтая дарожка, так уквечаная, у далейшым працягу — пухам услана і ўгодай падшыта.

Гэта ах, далёка ня нашая дарожка!

**Беларуская Кнігарня Беларускага Выдавецкага Т-ва,** гэтым даводзіць да ведама сваіх кліентаў, што адрыўны календар на 1928 г. ужо зусім распрадачы. Не дастаўшых календары, а выслаўшых на іх грошы кнігарня просіць паведаміць, што выслаць заместа календароў.

**Ахвяры.** Атрымана на карысьць пацярпеўшых ад стыхійных няшчасьцяў ад грам. вёскі Нецечы гм. Лаша, Горадзенскага пав. цераз Тодара Хоцька 28 зл. 25 гр.

Камітэт Помачы Ахвярам Стыхійных няшчасьцяў усім ахвярадаўцам складае шчырую падзяку і сяброўскае правітаньне.

## Паштовая скрынка.

**Грамадзяніну Стойкаму з Наваградчыны.** Вы пішаце, што з мамэнту дагоды грам. М. Чатыркі з Міністэрствам Асьветы сяляне баяцца заходзіцца ў Акружную Управу і затурбованы будучым зьездам 16-га студзеня. Вас наагул цікавіць, ці падобная дагода была зроблена ўсім Таварыствам. Наскольні Вашы турботы слушныя, мусіць паказаць самы зьезд. Усё Т-ва Беларускае Школы ніякіх дагодаў з Міністэрствам не рабіла.

# З Т-ва Бел. Школы.

## Праца гурткоў Т-ва Беларускае Школы.

**Мядзьведзецкі гурток,** Дзісьненскага пав. на агульным сходзе сяброў гуртка 20 лістапада пастанавіў:

1) Адчыніць аддзел Глыбоцкага Каапэратыва „Сноп“ у мястэчку Галубічы.

2) Адчыніць пры гуртку бібліятэку-чытальню імені Якуба Коласа ў хаце Сымона Рэдзькі, вызначаўшы плату за карыстаньне бібліятэкай 20 гр. ў месяц.

3) Дамагацца ўрадавай беларускай школы, для чаго пашырыць складаньне дэкляарацыяў.

4) Наладзіць спэктакль-вечарыну.

**Рудзінскі гурток,** Косаўскага пав., наладзіў спэктакль-вечарыну 11/XII 27 г. ў в. Азёрцы. Гулялі „Ня розумам сьцяміў, а сэрцам“. Глядзельнікаў было замнога на цеснае памешканьне. Чысты даход пайшоў на карысьць бібліятэк-чытальняў у в. в. Азёрцы і Руда.

**Літоўскі гурток,** Маладэчанскае гміны 27 лістапада наладзіў спэктакль-вечарыну ў в. Літва. Гулялі „Ня розумам сьцяміў, а сэрцам“. Саля была добра ўбрана стараньнем вясковых дзяўчат. Громам воплескаў глядзельнікаў закончыўся спэктакль, які зрабіў вельмі прыемнае ўражаньне на сялян.

# КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

## Сяляне! Асьцерагайцеся ашуканцаў!

У зьвязку з прыбліжэньнем дня галасаваньня, прыбываюць у нашыя закіненыя вёскі што раз то новыя й новыя кадры няпрошаных гасьцей — агітатараў тых партыяў, якія здэмаскаваліся ў вачох сялянскіх масаў ні то кампрамісамі, ні то хаўрусамі, або проста сваёй услужлівасьцю перад панамі і буржуазіяй.

Каб здабыць галасы беларускага сялянства, каб лягчэй ачмуціць беднату, гэтыя ўсе панскія партыі кідаюць у гушчу (толькі на час выбараў) салодкія лёзунгі, перакручваюць назовы сваіх партыяў, творачы нейкія „Zjednoczenia“ „Bezpartyjnošć“ і тым падоб.

Так абшарнікі Вялейскага павету, хочучы скарыстаць беларускія галасы й правясьці ў Сойм свайго кандыдата і гэтым самым жадаючы перашкодзіць мамэнту выяўленьня нашай сьведамасьці, стварылі нейкую дзіўную й сьмешную партыю „Zjednoczenie bezpartyjne“, якая кругам сваей дзейнасьці лічыць гміны: Войстамскую, Жодзіжскую, Вішнеўскую, Іжанскую і Вялейскую.

Ініцыятарам гэтае ашуканскае выбарнае акцыі зьяўляецца былы капітан польскае арміі абшарнік Казлоўскі, які цяпер служыць у „Związku inwalidów“ у м. Вільні. Відаць, што гэтаму вяльможнаму пану зажадалася вельмі стацца паслом, бо выставіў навет сваю кандыдатуру на Вялейскі вокруг. Першым яго тэхнічным памоцнікам, які таксама спадзяецца прайсьці ў Сойм за сялянскія галасы — гэта йзноў жа былы капітан, цяпер асаднік і войт Войстамскае гміны, Талочка, які пасядае фальварак Надбжэзьзе.

Гэты-жа Талочка з цэлым штатам панскіх падлізаў — шляхцюкоў, як Буцька з ф. Ушакова і з падкупленымі праз нясьведамасьць сялянамі, як: Капец з в. Мартышак, Найдзіч з в. Крунь, разьяжджалі па вёсках вышэйўпамянутых гмін, ды чмуцілі нашае сялянства.

Так ён, скарыстаўшы з нясьведамасьці сялянства Войстамскае гміны, залажыў неяк мяйсцовы выбарны камітэт у м-ку Войстаме. Пасьля маленькае ўдачы ў Войстамскай гміне пан Талочка пакіраваў сваю акцыю ў Жодзіжскую гміну і сазваў зьезд у в. Гардзінятах. Сабралося на зьезьдзе сялянства досыць лічна. Яшчэ перад адчыненьнем зьезду панавала між прысутнымі асаблівая атмасфэра, якая, як бы напамінала вяльможным паном, што справа кончыцца з незавідным вынікам для іх.

З арганізацыйнай прамовай выступіў п. Талочка, які плявузгаў аб шкоднасьці партыяў, а выстаўляў лёзунг беспартыйнасьці (ці-ж тут ёсьць, браточкі, які небудзь сэнс?), паводле якога яны будуць ісьці на выбарах.

Нам трэ' ведаць, што хто б ня выступаў у імя беспартыйнасьці, той заўсёды у будучыне пакажацца або манархістам, або панскім і буржуазным абаронцам, што добра нам паказаў факт выбараў у мястовую раду м. Вільні. Той толькі хаваецца ў маску беспартыйнасьці, каму страх паказаць свайго сапраўднага выражэньня, бо за імі сяляне ніколі ня пойдуць.

Тое-ж самае робяць, нашы ачмучаныя сяляне, і Казлоўскі з Талочкаю, ім страх паказаць свой уласны панскі твар і яны дурманяць вас нейкімі беспартыйнасьцямі.

Не пасьпеў яшчэ наш аратар Талочка даканчыць свайго „мудрага філязофстваваньня, як пасыпаліся на яго колькасотныя выкрыкі пратэсту з сялянскіх змучаных грудзей, пратэсту супроць яўнага ашуканства паноў, пратэсту, які ўжо накіпеў у іх праз столькі вякоў і якога без пажаданых вынікаў, ня ў сілах затушыць:

— Далоў здраднікаў!

— Вон ад нас ашуканцы! Вам па дарозе з багачамі!

— Досыць ужо вы, паны, нас ашуквалі, цяпер гэтаму канец!

— Мы за вас, паны, голаса ані воднага не дадзём, бо вы нашы ворагі!

— Мы галасуем толькі за сваіх працоўных, добра ведамых нам кандыдатаў!

Так гэты зьезд і правалілі самі сяляне, а пану Талочку і яго падлізам і дыхнуць не далі. Каб абараніць свой гонар, мусіў гэты пан выносіць чым хутчэй свае ногі.

Пасьля гэтага яшчэ доўга сяляне нараджаліся, як ім найлепш бараніцца ад падобных ашуканцаў.

Сяляне другіх гмінаў сьцеражэцеся! Не давайцеся ашуківаць гэтым прыблуднікам. Калі да вас зьявяцца гэтыя „дабрадзеі“, паступайце з імі так, як сяляне Жодзіжскай гміны.

Не ўдалося п. Талочку гэта акцыя ў Жодзіжкай гміне, ён накіруе яе ў другія мяйсцовасьці.

Будзьма асьцярожнымі!

Дык увага!

8.I-28 г. п. Казлоўскі склікае павятовы зьезд у Вялейцы.

Сяляне, якія будзеце прысутнымі на зьезьдзе праз нясьведамасьць, ня дайцеся ашукаць. А лепш, сяляне, каб мець чыстае сумленьне, на такія зьезды ня ехаць.

**Селянін з пад Войстама.**

## „Тоже дѣятель“.

(в. Прыднікі, Валожынскага пав.).

Пачуў наш Явка Бажаркевіч, што цяпер можна зарабіць, ловячы рыбку ў мутнай вадзе. Відаць, зьнюхаўся з Паўлюкевічам, бо нешта надта пакахаў яго (а мо' толькі грошы) і пачаў хваліць, што ён чалавек чэсны, любіць Беларусь (хаця працоўны люд лічыць за быдла) і крычыць усюды, каб яго падтрымала сялянства.

Мо' чытач падумае, што яму вераць? Напэўна — столькі, скольні авечка ваўку, але-ж для такіх людзішак сумленьне ня існуе, бо яно прадана за павлюкевічавы нікельнікі.

А вам, сяляне, параю гнаць гэтых прадажнікаў ад сябе, бо той, хто сябе прадае за грошы, варт аднаго слова: „сабака“.

**Вораг здраднікаў.**

## Пісьмо у Рэдакцыю.

*Паважаны Грамадзянін Рэдактар!*

Прашу надрукаваць у Вашай паважанай газэце наступнае:

Распаўсюдзіліся чуткі, што я нібыта прыступіў да блёку нацыянальных меншасьцяў і што ад імя гэтага блёку выстаўлена мая кандыдатура ў Сойм па Лідзкай Акрузе. Гэтым заяўляю, што да названага блёку я ня прыступаў і ня думаю прыступаць.

Відаць, публіка ўведзена ў абмылку тым, што па Лідзкай Акрузе, па чутках, выстаўлена кандыдатура раднага Лазара Крука, які належыць да блёку нацыянальных меншасьцяў.

З пашанай **Кузьма Крук.**



Рэдактар-Выдавец: М. Гэрмановіч.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.